

## Настасся Чыркова

### ВЯНОК ПАЭТУ

На юбілей твой сёння прыняслі мы

Сваёй любві і ўдзячнасці вянок.

Хай ляжа побач з ружамі жывымі

І майго верша сціплага радок.

Далёка час,

Калі над родным краем

Звінеў твой голас, да свабоды зваў.

Ідуць гады,

А мы не забываем

Паэм тваіх, трылогій, тваіх спраў.

Ідуць гады…

Ужо болей за сто трыццаць.

І будзе дзвесце, трыста і пяцьсот.

І ў кожны юбілей твой заіскрыцца

На небе зорак слаўны карагод.

Цвіце наш край пад мірным ясным небам.

І ты жывеш і будзеш жыць у ім.

А быў ты зернем, што ўпала ў глебу,

Прарос жа Коласам ты залатым.

На юбілей твой сёння прыняслі мы

Сваёй любві і ўдзячнасці вянок.

Хай ляжа побач з ружамі жывымі

І майго верша сціплага вянок.